3. Энциклопедический словарь по культурологии. – М. : Центр, 1997. – С. 190– 191.

4. Элитарная, популярная, массовая культура [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://studopedia.net/9_76877_elitarnaya-populyarnaya-massovaya-kultura.html. – Дата доступа : 19. 03. 2015.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Мацеша В.А.,** студ. 313 гр.
Навуковы кіраўнік – Бабко А. І.

## ПРАБЛЕМА АБОРТАЎ
## У СУЧАСНЫМ БІЯЭТЫЧНЫМ ДЫСКУРСЕ

Біяэтыка – сфера міждысцыплінарных даследаванняў, сацыяльны інстытут, для якіх характэрна асэнсаванне, абмеркаванне і вырашэнне маральных праблем, спароджаных найноўшымі дасягненнямі біямедыцынскай навукі і практыкі.

Метад біяэтыкі мае дыялагічны характар. Яго сутнасць у публічным пагрунтаваным на рацыянальнай аргументацыі абмеркаванні праблем усімі зацікаўленымі бакамі з мэтай дасягнення паразумення і пошуку ўзаемапрымальнага рашэння.

Тэма дадзенага даследвання – адна з сучасных праблем біяэтыкі, праблема абортаў. У свеце робіцца каля 43 млн. абортаў у год. У ЗША ў 2008 годзе на 100 родаў прыпадала па 23 з паловай абортаў. У 2009 годзе ў Расіі зроблена 1млн 292 тыс. дадзеных аперацый. У Рэспубліцы Беларусь у 2012 годзе было выканана 28 з паловай тысяч абортаў. Гэта статыстыка ўказвае на маштабы праблемы.

У наш час аборты здзяйсняюцца па наступных прычынах:

40% па жаданні жанчыны;

25% па жыццевых абставінах;

23% па сацыяльных абставінах;

12% па медыцынскіх абставінах [1].

Існуюць разнастайныя погляды на дадзеную праблему. Параўнаем два процілеглыя пункты гледжання на яе. Першы пункт гледжання выяўляе такую думку, што аборт – гэта асабістая праблема, якая нікога, акрамя самай жанчыны, не закранае, у якую ніхто не павінен умешвацца. Гэта проста адна з медыцынскіх аперацый, і, як у выпадку кожнай хірургічнай аперацыі, усе праблемы вырашаюцца лекарам і пацыентам. Другі пункт гледжання ўяўляе сабой процілеглы полюс: аборт абражае маральнае пачуццё, таму тут існуе этычная праблема, і прытым – надзвычай складаная, бо ў адрозненне ад любой хірургічнай аперацыі, дадзеная мае адмысловую мэту – знішчыць жыццё, забіць чалавечую істоту. Паміж двума гэтымі крайнімі пунктамі гледжання і ляжыць праблемнае поле, на якім разгортваецца драматычнае супрацьстаянне і сутыкненне розных пазіцый, пунктаў гледжання, падыходаў, ацэнак, меркаванняў, настолькі вострых і драматычных, што яно выплюхваецца на вуліцы, становіцца прадметам масавых маніфестацый, мітынгаў і дэманстрацый [3].

У маральным плане праблема аборту ўяўляе сабою антыномію (у сэнсе Канта): маюцца па-свойму пераканаўчыя аргументы як “за”, так і “супраць”. Асновай спрэчкі тых, хто дапускае магчымасць абортаў і тых, хто яе адмаўляе, з’яўляецца па сутнасці сваёй філасофская праблема прыроды і статусу чалавечага эмбрыёна. Тут можна вылучыць тры асноўных пазіцыі:

Ліберальная пазіцыя – эмбрыён да моманту нараджэння з'яўляецца часткай цела маці і правам на жыццё не валодае. Таму аборт маральна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дапушчальны на любой стадыі яго развіцця [2]. Акрамя таго, існуюць іншыя аргументы "за":

1. У пераважнай большасці выпадкаў аборт робяць на першым трыместры, калі плод не можа існаваць асобна ад маці і функцыяніраваць як чалавек. Паколькі эмбрыён злучаны з мацярынскім арганізмам, яго стан залежыць ад здароўя маці, таму яго нельга разглядаць як чалавечую істоту.

2. "Свядомасць" і "жыццё" – гэта зусім розныя паняцці. Нават калі пагадзіцца з тым, што жыццё чалавека пачынаецца ў момант зачацця, што тады сказаць пра штучнае апладненне? У гэтым выпадку аплодненыя яйцаклеткі, якія выкарыстоўваюцца для апладнення in vitro, – таксама чыесьці жыцці, але бесперспектыўныя яйцаклеткі проста знішчаюцца. Ці варта лічыць гэта забойствам? Калі не, то чаму ж тады забойствам лічыцца аборт?

3. Адмаўленне ад дзіцяці – гэта не альтэрнатыва аборту, таму што адпаведнае рашэнне жанчына прымае сама, а цяжарнасць настае без яе жадання. Статыстыка паказвае, што жанчыны, якія вынасілі і нарадзілі дзіця, вельмі рэдка ад яго адмаўляюцца, нават калі асабістыя абставіны неспрыяльныя.

4. Нельга прымушаць жанчыну выношваць дзіця, зачатае ў выніку гвалту, – гэта толькі пагоршыць яе псіхалагічную траўму, што можа прывесці да самых кепскіх наступстваў як для жанчыны, так і для дзіцяці.

5. Грошы падаткаплацельшчыкаў выкарыстоўваюцца не для "патурання распусце", а для таго, каб у маламаёмных жанчын была магчымасць скарыстацца такім сама ўзроўнем медыцынскага абслугоўвання, што ў заможных жанчын. Аборт таксама ўваходзіць у медыцынскае абслугоўванне. "Фінансаваць" аборт – усё адно, што фінансаваць вайну на Блізкім Усходзе ці непапулярныя рэформы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Лёс непаўналетніх маці складаецца наўрад ці больш удала, чым жыццё тых, якія ў падлеткавым узросце зрабілі аборт. У шматлікіх выпадках яны не завяршаюць вучобу і не атрымліваюць нават сярэднюю адукацыю; яны не могуць разлічваць на высокааплатную працу і не могуць стварыць нармальныя ўмовы для дзіцяці, залежачы ад дапамогі сацыяльных службаў; у іх з'яўляюцца праблемы са здароўем, а іх сем'і хутка распадаюцца.

Кансерватыўная пазіцыя – эмбрыён з моманту зачацця з'яўляецца чалавекам, які валодае у поўнай меры правам на жыццё. Такім чынам, аборт – гэта форма забойства чалавека. Яскравым прыкладам кансерватыўнай пазіцыі з'яуляюцца падыходы да праблемы, якія грунтуюцца на рэлігійных уяўленнях. Хрысціянства традыцыйна прыраўноўвае аборт да забойства чалавека. Пэўнае змякчэнне негатыўнай ацэнкі аборту дапушчаецца ў тым выпадку, калі цяжарнасць пагражае жыццю маці. Практычна на блізкіх пазіцыях стаяць прадстаўнікі іншых хрысціянскіх канфесій, а таксама ісламу, юдаізму і будызму [2]. Акрамя таго існуюць іншыя аргументы “супраць”:

1. Паколькі жыццё чалавека пачынаецца ў момант зачацця, аборт раўнасільны забойству, бо робячы аборт, жанчына пазбаўляе жыцця ненароджанае дзіця. Аборт – гэта знявага галоўнай ідэі чалавечай маралі, ідэі пра недатыкальнасць жыцця чалавека.

2. Цывілізаванае грамадства не павінна дапушчаць бяскарнага прычынення наўмыснай шкоды адным чалавекам іншаму, і тым больш не патураць пазбаўленню жыцця, а што такое аборт, як не пазбаўленне жыцця?

3. Калі гаворка ідзе пра ахвяру гвалту ці інцэста, своечасова прадпрынятыя медыцынскія меры гарантуюць, што жанчына не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зацяжарыць. Аборт – гэта пакаранне, якое нясе ненароджанае яшчэ дзіця, той хто не здзейсніў злачынства, а караць трэба злачынцаў.

4. Шматлікія грамадзяне выступаюць супраць аборту, таму выкарыстоўваць іх грошы для дзяржаўнага фінансавання такога кшталту аперацый амаральна.

5. Больш траціны абортаў робяць непаўналетнія ці маладыя дзяўчыны, у якіх няма жыццёвага досведу, каб усвядоміць хібнасць гэтага рашэння. Шматлікія з іх пасля шкадуюць пра гэта ўсё жыццё.

6. Аборт нярэдка цягне за сабой стрэс і глыбокую дэпрэсію.

Умераная (градуалісцкая) пазіцыя – ад моманту зачацця да дасягнення жыццяздольнасці адбываецца паступовае нарастанне асобасных якасцяў плоду. Аб'ём гэтых якасцяў мінімальны ў першыя тры месяца цяжарнасці. Таму аборт маральна дапушчальны толькі на пачатковых стадыях развіцця плоду [2].

Можна прыйсці да высновы, што любая, нават самая вострая праблема знойдзе сваё рашэнне. Сапраўды ў любой складанай сітуацыі можна і трэба прыходзіць да нейкага кампрамісу, шукаць залатую сярэдзіну, бо свет не падзяляецца на дабро і зло. Ды і ў цэлым чалавецтву трэба сталець, і зразумець, што нельга да ўсяго ставіцца строга катэгарычна.

Пры гэтым, вельмі важна, каб людзі былі адказнымі за свае дзеі. Шмат хто з іх па прычыне свайго страху і эгаізму спрабуюць знайсці самы просты шлях да рашэння праблем, хоць самы просты, не значыць правільны. Калі людзі наблізіліся б да разумення чалавечага быцця, тады, магчыма, праблемы планетарнага маштабу вырашаліся б хутчэй і прасцей. Гэта мае моц і ў дачыненні да праблемы абортаў. Як патэнцыйны чалавек эмбрыён валодае адмысловым маральным статусам. На любой стадыі свайго развіцця ён заслугоўвае павагі як носьбіт чалавечай добрай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

годнасці. Таму, як падкрэслена вышэй, да прыняцця рашэння ў дадзеным выпадку неабходна ставіцца з максімальнай адказнасцю.

---

1. Аборт // Википедия [электронный ресурс]. – Режим доступа : https://ru.wikipedia.org. – Дата доступа : 25.01.2006.

2. Биоэтика: принципы, правила, проблемы. – М. : Эдиториал УРСС, 1998. – 472 с.

3. Логиновская, Л.М. Биоэтика для школьного и внешкольного образования : учебно-методич. пособ. / Л.М. Логиновская, Т. В. Силич, С. А. Ставропольцева; под общ. ред. Т. В. Мишаткиной. – Мн. : МГЭУ им. А. Д. Сахарова, 2008. – 184 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Меджидова М.В.,** студ. 431а гр.
Научный руководитель – Зыгмантович С.В.

## РАБОТА ПУБЛИЧНЫХ БИБЛИОТЕК ПО ОРГАНИЗАЦИИ СВОБОДНОГО ДОСТУПА ПОЛЬЗОВАТЕЛЕЙ К ИНФОРМАЦИИ (НА ОПЫТЕ РАБОТЫ ЦЕНТРАЛИЗОВАННОЙ СЕТИ ПУБЛИЧНЫХ БИБЛИОТЕК СЛАВГОРОДСКОГО РАЙОНА)

На современном этапе все библиотеки государственного учреждения культуры «Централизованная сеть публичных библиотек Славгородского района» *(Могилёвская область)*, исходя из своих возможностей, работают над реализацией информационной функции библиотек, одной из составляющих которой является формирование системы свободного доступа к информации без нарушения прав авторов, издателей,